

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№27 (369) Серада, 30 чэрвеня 2004 года gs.promedia.by



свежай і разнастайнай інфармацыі



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ У Зэльве на кірмашы было ўсё, але найбольш людзям спадабаўся конкурс павозак

АННЕНСКІ КІРМАШ ПРАЙШОЎ У ЗЭЛЬВЕ

У нядзелю, 27 чэрвеня, у Зэльве адбылося свята Гродзенскай вобласці — Анненскі кірмаш

Чытайце на 29 стар.

ПЕСНЯМІ ПАРАДУЮЦЬ СЛОНІМЦАЎ "ПЕСНЯРЫ", ЛАРЫСА ГРЫБАЛЁВА І ЮЛІЯ КРОТ

Калі зэльвенцы весяліліся ў мінулую нядзелю, святкуючы сваё гістарычнае свята — Анненскі кірмаш, то слонімцаў чакае адпачынак у наступную нядзелю, 4 ліпеня. На свята горада прыедуць эстрадныя выканаўцы з Мінска, Польшчы, а таксама землякоў парадуюць песнямі юныя слонімскія артысты. У гэты дзень будуць яшчэ смачныя ласункі, піва, гарэлка і танцы. Сустрэнемся на свяце!

Праграма свята на старонцы 13.

ЗДАРЭННІ

ВОСЕМ ГАДЗІН НА СВАБОДЗЕ

У ноч з суботы на нядзелю ў краму "Лета" ў Слоніме зайшоў малады мужчына з прыпаленай цыгарэтай.

Дзяжурны міліцыянер зрабіў нахабнаму наведвальніку заўвагу, пасля чаго той накінуўся на ахоўніка правапарадку з кулакамі, а пасля бойкі кінуўся ўцякаць.

Аднак міліцыянеру ўдалося дагнаць хулігана і надзець на яго кайданкі.

Затрыманы аказаўся былым зэкам, які толькі 8 гадзін назад вызваліўся з калоніі. За плячыма маладога чалавека (1975 года нараджэння) ужо былі некалькі "ходак" на зону. Цяпер за супраціўленне работніку міліцыі ў адносінах да яго ўзбуджана новая крымінальная справа.

НА ФУТБОЛ – НА ЧУЖЫМ ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Днём 27 чэрвеня, перад пачаткам футбольнага матча "Камунальнік" – "Ведрыч – 97", каля крамы №48 на Савецкай вуліцы футбольны балельшчык з Рэчыцы сеў на чужы веласіпед і паехаў на стадыён.

Паглядзець футбольны матч госцю, аднак, не ўдалося. Па дарозе яго затрымалі работнікі міліцыі.

Праводзіцца праверка.

НЯПРОШАНЫХ ГАСЦЕЙ НАПАЛОХАЎ СУСЕД

Невядомыя "дамушнікі" настрашылі ноччу 25 чэрвеня гаспадыню адной з кватэр, што на плошчы Леніна ў цэнтры горада.

Яны спрабавалі адчыніць дзверы і пранікнуць у кватэру ў той час, калі гаспадыня знаходзілася дома.

Пачуўшы шум, на лесвічную пляцоўку выйшаў сусед і асвяціў няпрошаных гасцей ліхтарыкам. Пасля чаго тыя кінуліся ўцякаць.

Юрка КАРПАЧ

НАВАТ БОГА НЕ ПАБАЯЛІСЯ

Са сталярнай майстэрні духоўнага вучылішча жаночага філіяла Жыровіцкага манастыра на вуліцы Віленскай у Слоніме невядомыя асобы ноччу ўкралі фрэзерны станок, дзве электрадрэлі, электрапілу, шліфавальную машынку, лобзік і іншае на агульную суму 1 947 тысяч рублёў.

Хто пакрыўдзіў божых служак, павінна вызначыць следства, піша "Міліцэйскі веснік".

Мікола КАНАНОВІЧ

УДАКЛАДНЕННЕ

У мінулым нумары "ГС" (№26) у артыкуле "І электраэнергію крадуць" была дапушчана фактычная недакладнасць. У трэцім сказе трэба чытаць: "Усе іскі суд задаволіў, зменшыўшы суму да **4** мільёнаў 48 тысяч".

ГОСЦІ



■ У час сустрэчы дэпутатаў Турцыі ў мячэці

ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ТУРЦЫІ НАВЕДАЛА НАШ ГОРАД

■ Сяргей ЧЫГРЫН

На мінулым тыдні нашу рэспубліку наведалі дэпутаты парламента Рэспублікі Турцыя. Пабывалі яны і ў Слоніме.

Разам з імі на сустрэчы прысутнічаў пасол Рэспублікі Турцыя ў Беларусі Алі Вурал Ст эм. Дарэчы, гэта яго другі візіт на Слонімшчыну.

Першая сустрэча замежных гасцей адбылася ў Слонімскім райвыканкаме, дзе іх прымаў старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк. Падчас гутаркі гасцей пазнаёмілі з гісторыка-эканамічным развіццём Слоніма. Туркаў зацікавілі такія прадпрыемствы, як мэблевая фабрыка, фабрыка мастацкіх вырабаў і фабрыка пер'е-пуховых вырабаў. Але нейкіх канкрэтных прапаноў госці так і не выказалі.

Пасля райвыканкама турэцкія парламентарыі наведалі слонімскую мячэць, якая знаходзіцца на вуліцы Агінскага. Імам-старшыня мясцовай суполкі мусульман Сулейман Байрашэўскі правёў экскурсію па мячэці, распавёў пра свае рэлігійныя справы. Дарэчы, нядаўна Сулейман Мацвеевіч вярнуўся з Мінска, дзе ён сустракаўся з прэм'ер-міністрам Татарстана Рустамам Мінніханавым. Прэм'ер-міністр шчыра падзякаваў слонімскім мусульманам за тое, што яны ўшаноўваюць памяць пра татар, загінуўшых у першую сусветную вайну, і даглядаюць магілы воінаў на слонімскіх мусульманскіх могілках. І турэцкія парламентарыі, і прэм'ер-міністр Татарстана ўручылі слонімскім мусульманам свае сувеніры.

Пасля наведвання мячэці госці з Турцыі пабывалі ў Жыровіцкім манастыры і ў семінарыі. Дарэчы, у Беларусі зарэгістравана 21 прадпрыемства з удзелам турэцкага капіталу, развіваецца супрацоўніцтва ў галіне будаўніцтва, адукацыі і навукі. ■

ЗДАРЭННІ

ПЛІТА ЎПАЛА НА ХЛОПЧЫКА

У рэдакцыю нашай газеты прыйшла сланімчанка Ірына Сямёнаўна Зангіёнава і расказала пра выпадак, які нядаўна здарыўся з яе маленькім сынам Цімурам.

Цімур гуляў з дзецьмі каля дома №24 на вуліцы Карбышава. Падчас адпачынку на хлопчыка з казырка пад'езда гэтага дома абвалілася пліта. Хлопчыка з цяжкімі траўмамі завезлі ў бальніцу.

Карэспандэнты "ГС" выехалі на месца здарэння і на свае вочы ўбачылі тую пліту, якая цудам не забіла дзіця. Ніхто не дае гарантыі, што праз пэўны час і іншыя пліты зверху не паляцяць на галовы жыхароў гэтага дома.

Побач з гэтым домам наогул адсутнічае дзіцячая пляцоўка. За некалькі метраў ад пад'езда дома праходзяць трубы цеплатрасы. І там вялікая пліта, якая накрывае гэтыя трубы, трымаецца на цэглах. У любы час яна таксама можа з'ехаць на ногі людзям.

У сувязі з гэтым карэспандэнт "ГС" папрасіў пракаментаваць гэты выпадак з хлопчыкам начальніка Слонімскай ЖЭС №1 Сяргея Барбуцьку.



■ Ірына Зангіёнава расказвае пра выпадак з сынам

Сяргей Мітрафанавіч, у прыватнасці, сказаў: "Я ведаю пра гэты выпадак. Але скажу, што пліта сама не ўпала на хлопчыка. Вінаваты ва ўсім ён сам. Цімур лез па газавай трубе наверх, але там было не так лёгка прабрацца. Ён нагамі закрануў гэтую пліту, і яна ўпала на яго. Калі б пліта сама па сабе звалілася на чалавека і прычыніла б яму траўму, адказвала б наша жыллёва-эксплуатацыйная служба".

Іншага каментарыя тут, здаецца, і не трэба, але як у такім разе была замацавана бетонная пліта, калі маленькі хлопчык здолеў яе зварушыць з месца? Можа, ёсць сэнс гэты выпадак зарэгістраваць у Кнізе рэкордаў Гінеса? Хай ведае люд свету пра мясцовага асілка.

Сяргей ЧЫГРЫН

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
29.06.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	6 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 000 - 1 500 руб.
Картофель молодой (кг) старый (ведро)	1 000 - 2 500 руб 500 - 2 000 руб
Капуста свежая	800 - 900 руб.
Морковь	1 200 руб
Лук	600 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	2 300 - 2 600 руб
Огурцы	700 - 900 руб.
Яблоки	2 000 - 2 900 руб.
Апельсины	2 200 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 400 руб
Лимоны	2 800 - 3 300 руб.
Киви	350 руб. шт.
Гранаты	3 100 руб.
Бананы	2 000 - 2 200 руб
Свинина	4 500 - 9 430 руб.
Говядина	500 – 8 800 руб.
Телятина	–
Сало свежее	2 350 - 3 900 руб
солёное	3 900 - 4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб
Макаронные изделия	1 200 - 1 400 руб.
Гречка	1 200 - 1 700 руб.
Рис	1 150 - 1 500 руб.
Мука (2 кг)	2 100 - 2 200 руб.
Сахар	не продаётся
Подсолнечное масло, (1 л)	1 900 - 2 600 руб
Мёд	12 000 руб.
Клубника	2 500 - 3 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
29.06.2004 г.

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2180
1 EURO	2560	2660
1 ZL	510	580
1 RUR	72	75
"Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2145	2172
1 EURO	2580	2645
1 ZL	530	585
1 RUR	73,5	74,9
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2175
1 EURO	2530	2630
1 ZL	450	580
1 LAT	3800	4050
1 LIT	600	780
1 UAH	370	420
1 GBP	3700	3980
1 RUR	69	75
Нацбанк РБ		
1 USD	2154	
1 EURO	2620,02	
1 RUR	74,21	

ЗДАРЭННІ

УЗБУДЖАНЫ КРЫМІНАЛЬНЫЯ СПРАВЫ

Восьмага чэрвеня работнікі міліцыі затрымалі на вуліцы Ружанскай мясцовую жыхарку і знайшлі ў яе наркатычнае рэчыва.

Экспертыза паказала, што гэта была марыхуана. На мінулым тыдні супраць жанчыны ўзбудзілі крымінальную справу.

21 чэрвеня на аўтобусным прыпынку "Аптэка" слонімец Т. падманным шляхам завалодаў мабільным тэлефонам падлетка. Цяпер яму прыйдзецца адказваць па артыкуле Крымінальнага кодэкса "Ашуканства".

Не пашчасціла 21 чэрвеня жыхарцы вёскі Сурынка – невядомы зладзей украў у жанчыны новы веласіпед. Па факце крадзяжу таксама ўзбуджана крымінальная справа.

Юрка КАРПАЧ

ОПРОС

СЛОНИМ. НАШИ ЛЮДИ

С вопросом "Что на сегодняшний день является для вас роскошью?" корреспондент "ГС" обратилась к слонимчанам.



Инна:
– На сегодняшний день для меня роскошью являются поправка здоровья и комфортный, хороший отдых. Поездка за границу – предмет мечтаний.



Галина Добриян:
– Для меня роскошь – машина. Дом у меня есть, от родителей в наследство перешел. В доме тоже все есть. А о недосягаемых вещах я не думаю. Только машина, наверное...



Владимир:
– Недосягаемого в жизни много. А препятствий еще больше, и в первую очередь это материальное положение. И еще, может быть, недостаточно усилий прилагаю. Можно было бы куда-то поехать, заработать денег, но у меня одинокая мама, которая воспитывает племянницу. Сестра умерла. Одна – старая, другая – малая. Я не могу их оставить.



Екатерина Павловна (приехала в Слоним из России):
– Лекарства. Я инвалид 2-ой группы, астматик. Очень от них завишу. Если отменят рецепты на льготные лекарства, а в России сейчас ходят об этом слухи, то для меня это будет катастрофой. Пенсия маленькая, денег просто не хватит. А так у меня все есть.




Юлия Николаевна:
– У меня все в общем-то есть. Я такой человек по жизни – не хочу многого. А мечта есть – иметь свой дом или квартиру.

Вот и получается, чтобы недосягаемые желания не бередили душу, слонимчане стараются не желать ничего "такого". И роскошью, как всегда, остаются хорошая зарплата и крепкое здоровье. Что больше? Трудно сказать.

Янина МЕЛЬНИКОВА

ПРАБЛЕМА

БАТОНЫ СЛОНІМСКАГА ХЛЕБАЗАВОДА "ЗАХВАРЭЛІ" НА БУЛЬБЯНУЮ ХВАРОБУ



Сяргей ЧЫГРЫН

На мінулым тыдні ў рэдакцыю нашай газеты пачалі тэлефанаваць людзі і выказваць сваё абурэнне наконт якасці батонаў "Лошицких", якія выпякае Слонімскі хлебазавод.

Тэлефанавалі не толькі гараджане, але і вяскоўцы з Сянькоўшчыны і з іншых вёсак раёна. Некалькі батонаў нават прынеслі ў рэдакцыю. І сапраўды, калі разрэзалі мучныя вырабы, – ад іх пайшоў непрыемны смярдзючы пах. Дык у чым справа? Чаму вялікая колькасць батонаў аказалася нягоднай да ўжывання? Наш карэспандэнт сустрэўся з начальнікам вытворча-тэхнічнай лабараторыі Слонімскага хлебазавода Наталляй Астапчык і папрасіў яе пракаментаваць сітуацыю з няякаснымі вырабамі. Наталля Дзмітрыеўна, у прыватнасці, сказала:

– У такое летняе надвор'е на хлебазаводах здараюцца выпадкі бульбяной хваробы хлеба. Гэта адна з найбольш распаўсюджаных хваробаў, якая наносіць эканамічныя страты хлебапякарнай прамысловасці, гандлю і спажыўцам. Такая хвароба, на жаль, не абышла і нашага прадпрыемства. Ад гэтай бульбяной хваробы церпяць у вялікай колькасці найперш вырабы з пшанічнай мукі, бо ў іх – нізкая кіслотнасць у параўнанні з вырабамі з жытняй мукі. Звязана гэтая хвароба і з павышэннем вільготнасці паветра да 87%, і з павышэннем тэмпературы. Такія ўмовы і спрыяюць захворванню хлеба.

– Такія хлебабулачныя вырабы ўжываць ні ў якім выпадку нельга?

– Гэтак. Батоны са спецыфічным пахам, пацямнелым мякішам ужываць людзям забараняецца. І наогул сёння неабходна правільна захоўваць любы хлеб у хатніх умовах. Гэта значыць, нельга яго трымаць у цэлафанавых пакетах. Хлеб неабходна спажыць на працягу 24 гадзін. А пры знаходжанні прыкметаў захворвання хлеба ў хатніх умовах неабходна добра вымыць хлебніцы і палічкі, дзе ён захоўваўся.

– Што робіцца на прадпрыемстве ў сувязі з бульбяною хваробаю хлеба?

– Найперш праводзіцца дэзінфекцыя ліній вытворчасці булачных вырабаў. А таксама павышаецца кіслотнасць гатовых вырабаў з дабаўленнем мезафільнай закваскі.

– Як быць тым пакупнікам, якія за 700 рублёў купілі гэтыя няякасныя батоны?

– Вярнуць у магазін.

Пакупнікі батоны, вядома ж, вярнулі ў тыя крамы, дзе іх купілі. І добра тое, што ніхто са слонімцаў імі не атруціўся. Але пацярпела і само прадпрыемства, найперш панізіўся аўтарытэт яго вытворчай і гандлёвай дзейнасці. Хаця, шчыра кажучы, пакупнікоў вытворчыя праблемы на прадпрыемствах не цікавяць. Яны прыйшлі ў краму, заплацілі грошы і павінны набыць якасны тавар. Таму яшчэ раз хочацца нагадаць, каб людзі, перш чым купіць прадукты, глядзелі на тэрмін іх захоўвання і абавязкова бралі квіткі ў крамах. ■

СОЦЫУМ

ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД СЫНА?

Мікола КАНАНОВІЧ

Такое пытанне вельмі хвалюе на старасці гадоў слонімскую пенсіянерку Марыю Іванаўну. У свае 74 гады яна найбольш прагне спакою. Але спакойна жыць бабулі не даюць яе ўласныя сыны. І асабліва малодшы.

Пяць гадоў таму малодшы сын Марыі Іванаўны развёўся ў Гродне з жонкай і вярнуўся да маці ў Слонім. Аднак вяртанне дамоў блуднага сына не стала для Марыі Іванаўны радасцю. Ды і вярнуўся ён зусім не па-біблейску – былая жонка выжыла дармаеда з дому. П'яніца і дэбашыр, ён не мог утрымацца на працы больш за некалькі месяцаў. Тое ж самае працягвалася і ў Слоніме. Толькі тут нямоглая маці ніяк не можа супрацьстаяць п'янству, знявагам і насіллю з боку сына-алкаголіка.

У матчынай кватэры ён жыве без прапіскі. Але на птушыных правах сябе пры гэтым не адчувае. На жыццё, праўда, зарабіць не можа. А калі з'яўляюцца нейкія грошы, то ўсе ідуць на спіртное. П'юць разам са старэйшым братам. Той прапісаны і таксама жыве ў кватэры маці. Абое цяпер не працуюць, але патрабуюць, каб Марыя Іванаўна іх карміла. Старэйшы ціхі, рукі на маці не паднімае. Затое ад малодшага жанчына не мае паратунку. Нават тое, што купіць сабе паесці, – вымушана хаваць ад роднага сына. Але ад яго не вельмі схаваеш. Калі нешта спатрэбіцца, паломіць у кватэры усе замкі, але знойдзе.

Марыя Іванаўна шмат разоў шукала абароны ад сына ў міліцыі ды пракуратуры. Пісала туды заявы і скаргі сама, а таксама прасіла аб гэтым дачку. Але адзінае, чаго дамагалася ад праваахоўнікаў, – пасадзіць п'янчугу-дэбашыра "на суткі". Найлепшы для Марыі Іванаўны час – гэта калі сын сядзіць у мясцовай "кутузцы". А там ён вельмі часты госць. Толькі з пачатку гэтага года пабываў у пастарунку, можа, разоў дваццаць. Але ж тэрмін зняволення заканчваецца, ён выходзіць і пачынае здзекавацца з маці яшчэ з большым імпэтам.

Нядаўна скаргу жанчыны на сына разглядала адміністрацыйная камісія райвыканкама. У гэты час ён чарговы раз сядзеў "на сутках" і на пасяджэнні камісіі не прысутнічаў. Ды і ўладная камісія нічым сур'ёзным не пагражала дэбашыру. А вось Марыі Іванаўне на гэтым самым пасяджэнні камісіі прыгразілі штрафам за тое, што сын жыве ў яе кватэры без прапіскі. Жанчына ж якраз і прасіла, каб улады адмежавалі яе ад сына, выселілі яго з кватэры.

Пасля той адміністрацыйнай камісіі Марыя Іванаўна ўвогуле страціла надзею на тое, што ўлады здольныя неяк абярагчы яе ад сына.

"Гэта яе праблемы, што не можа дамовіцца са сваімі сынамі," – адказаў па тэлефоне дачцэ Марыі Іванаўны начальнік паважнага праваахоўнага ведамства.

Якім чынам 74-гадовая жанчына-інвалід (з цяжкасцю ходзіць з двума кіёчкамі) будзе дамаўляцца з дэградатам-алкаголікам – таксама яе праблемы. У свой час за старанную працу Марыю Іванаўну ўзнагароджвалі медалямі і нават ордэн далі. Сёння пенсіянерка-ардэнаносца, інвалід другой групы, не мае магчымасці спакойна жыць ва ўласнай хаце. За яе спіной толькі дачка, якая таксама, як і маці, у роспачы разводзіць рукамі: "Што рабіць?!"

Адказам на гэтае пытанне можа быць хіба наша класічнае: цярпець і чакаць. Чакаць, пакуль для алкаголіка вызваліцца месца ў ЛПП і яго бясплатна павязуць туды на лячэнне. Альбо чакаць, калі ён нарэшце "пагарыць" на нейкім сур'ёзным злачынстве і сядзе надоўга. Але ў любым выпадку ў Марыі Іванаўны ёсць рызыка не дачакацца такога зыходу і ў прамым сэнсе стаць ахвярай сына, калі доўга будзе заставацца з ім пад адным дахам. Беспрацоўных, бамжоў і алкаголікаў у нас становіцца ўсё больш. Людзі "ломяцца" пад цяжкам самых розных прычын. І на сацыяльна-бытавым узроўні (у сем'ях, што "не без вырадка") часта ўзнікаюць сітуацыі, калі дзяржава ніяк не можа гарантаваць бяспеку сваім грамадзянам.

P.S. Імя гераіні гэтай гісторыі зменена з этычных меркаванняў. ■

ЗДОРОВЬЕ

ОСТОРОЖНО: КЛЕЩИ!

На прошлой неделе в реанимационное отделение Слонимской районной больницы в тяжелом состоянии был доставлен 57-летний слонимчанин. По словам и.о. заведующего отделением анестезиологии, реанимации и интенсивной терапии Виктора Емельянчика, у мужчины – клещевой энцефалит.

Слонимчанин заболел, употребляя в пищу некипяченое козье молоко. Клещи, содержащие вирус, питались кровью коз, следовательно, молоко от этих животных оказалось небезопасным для здоровья человека.

А вообще-то, как сообщает информационное агентство БелаПАН, в последние пять лет в Беларуси отмечается рост заболеваемости клещевым энцефалитом и болезнью Лайма (клещевой боррелиоз). Об этом корреспонденту БелаПАН сообщил заместитель главного государственного санитарного врача Беларуси, главный врач Республиканского центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья Валерий Филонов.

Так, в 2003 году заболеваемость клещевым энцефалитом возросла по сравнению с предыдущим годом в три раза и составила 53 случая, а болезнью Лайма соответственно в 2,7 раза и составила 501 случай. Это, по словам специалиста, связано с увеличением численности переносчика инфекции от 16 до 55 процентов. Кроме того, в 2003 году в 4,4 раза – до 13 тысяч человек – увеличилось число лиц, пострадавших от укусов клещей.

Что касается ситуации в Слониме, так, по словам заведующей эпидотделом Слонимского районного центра гигиены и эпидемиологии Елены Добриян, в прошлом году не было случаев заболевания клещевым энцефалитом и болезни Лайма. Последний раз в 2002 году один человек болел клещевым энцефалитом и два – болезнью Лайма.

Клещевой энцефалит – это острое вирусное заболевание, сопровождающееся ознобом, головной болью, тошнотой, рвотой, головокружением и ноющими болями в конечностях.

Клещевой боррелиоз – острое, переходящее в хроническое, бактериальное заболевание, для которого характерны кожные высыпания, серозные менингиты, миокардиты и хронические артриты. Заражение этими болезнями, как правило, происходит через укус клеща.

Основные места обитания клещей – участки смешанного леса, лесные просеки, поляны с густой травой и кустарниками, вырубки со старыми пнями, хворостом и валежником. Свою активность они начинают проявлять при температуре выше пяти градусов. С повышением температуры число и активность их увеличивается, достигая максимума в мае–июне. В разгар лета, особенно жаркого и засушливого, клещи исчезают, но в сентябре появляются вновь и полностью исчезают в октябре.


Ольга ШИНКЕВИЧ

Как правильно одеваться, чтобы избежать нападения энцефалитных клещей при посещении леса

Для профилактики заражения клещевым энцефалитом лучшей мерой профилактики является прививка. Для профилактики нападения и укусов клещей необходимо помнить и выполнять следующие несложные правила при поездке за город на дачу, в лес и даже собираясь на прогулку в лесопарк в черте города. Одеться необходимо таким образом, чтобы клещ, попав на одежду, не смог присосаться к телу.


■ Энцефалитный клещ




■ Присосавшийся клещ (слева миллиметровая шкала)

При обнаружении присосавшегося клеща надо смазать его и кожу вокруг вазелином или любым маслом, кремом и выкручивать с помощью нитки, обматывая ею тело клеща, против часовой стрелки. После этого место присасывания необходимо обработать йодом. Если у вас появились первые признаки заболевания клещевым энцефалитом, необходимо немедленно обратиться за медицинской помощью.

СОЦЫУМ

ЗА ПАПЕРКУ 19 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ШКАДА

"Давялі мяне ўжо гэтыя бюракраты! — скардзіўся ў рэдакцыі "ГС" слонімскі пенсіянер Пётр Тумашчык. — За копію паперкі аб скасаванні шлюбу патрабуюць плаціць 19 тысяч рублёў. Не хачу я плаціць такія грошы невядома за што. З жонкай 20 гадоў таму развёўся, а тут зноў плаці".

Справа ў тым, што Пётр Іванавіч надумаўся абмяняць нарэшце стары савецкі пашпарт на новы беларускі. Тэрміны падціскаюць — старыя пашпарты дзейнічаюць толькі да 1 ліпеня гэтага года, а потым не будуць лічыцца за дакумент. Пенсіянер запоўніў у аддзеле пашпартна-візавай службы патрэбныя для абмену паперы, калі аказалася, што ў яго няма на руках пасведчання аб скасаванні шлюбу, згодна з якім заносіцца адпаведны запіс са старога пашпарта ў новы. Гэты дакумент, думае Пётр Іванавіч, некуды падзелі яго дзеці. Пасля разводу дзеці засталіся з бацькам. Але цяпер яны ўжо дарослыя і жывуць за мяжой. Ды як бы там ні было, а супрацоўнікі пашпартнага стала накіравалі Тумашчыка па даведку ў аддзел ЗАГС. Там пенсіянеру сказалі, што без праблем выпішуць копію пасведчання аб скасаванні шлюбу, але для гэтага трэба заплаціць 19 тысяч рублёў дзяржпошліны. Столькі каштуе сёння ў ЗАГСе любы дакумент, безадносна — пасведчанне гэта аб шлюбе, яго скасаванні ці аб смерці.

Але плаціць Пётр Іванавіч не хацеў. Тады работнікі ЗАГСа параілі яму вярнуцца ў аддзел пашпартна-візавай службы і папрасіць, каб там зрабілі на адрас ЗАГСа афіцыйны запыт на патрэбны дакумент, і тады яны вышлюць у пашпартны стол інфармацыю, якая нічога не будзе каштаваць пенсіянеру.

— Органы ўнутраных спраў маюць права рабіць афіцыйныя запыты, на якія мы абавязаны даць адказ. Але яны зусім не абавязаны гэта рабіць, — патлумачыла карэспандэнту "ГС" загадчыца аддзела ЗАГС Наталля Яўлаш.

Начальнік аддзела пашпартна-візавай службы Слонімскага РАУС Алена Ільіна, у сваю чаргу, патлумачыла, што яны сапраўды дапамагаюць старым і нямоглым людзям афармляць новыя пашпарты і робяць запыты ў розныя арганізацыі. Аднак яны не абавязаны рабіць так для ўсіх, ды і проста фізічна гэта нерэальна.

Пётр Тумашчык, дзякуй Богу, яшчэ мае сілу, каб паклапаціцца пра сябе. І пашпарт яму патрэбны. Вось толькі 19 тысяч ад пенсіі за копію страчанага пасведчання аб скасаванні шлюбу выкідаць шкада. Ды, відаць, прыйдзецца. Бо правілы такія, што, калі трэба паперка, — плаці.

Аднак 19 тысяч за адну паперку падаецца пенсіянеру непамерна вялікай платай пры сціплым памеры яго пенсіі. Ды каб не плаціць лішняга – трэба берагчы дакументы. У нас яны дарагія і могуць спатрэбіцца зусім нечакана і праз 20 гадоў.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

БУДУЦЬ БАЛЕРЫНАМІ

Тры слонімскія 11-гадовыя дзяўчынкі — Кацярына Уланава, Алена Кісялёва і Эліна Юрчык — сёлета паступілі ў Мінскі дзяржаўны харэаграфічны каледж на спецыяльнасць "артыст балета".

Пры вялікім конкурсе паступіць у гэтую навучальную ўстанову было не так і проста. Тым не менш юныя танцоркі адолелі ўсе творчыя конкурсы, і іх залічылі на першы курс. Пройдзе час, і, глядзіш, будуць нашыя землячкі выконваць галоўныя партыі ў "Лебядзіным возеры", "Жызелі", "Стварэнні свету". А сёння яны толькі пачынаюць шлях у балетнае мастацтва. Хаця са сцэнаю ўжо добра знаёмыя – не раз выступалі ў вядомым ансамблі "Каскад", якім кіруе Зоя Пятроўская. Дзякуючы Зоі Данілаўне, дзяўчынкі вырашылі ўсё сваё жыццё звязаць з танцамі.

Сяргей ЧЫГРЫН

У САЛДАЦКАГА ВОЗЕРА З'ЯВІЎСЯ ГАСПАДАР?

Нядаўна ў зямлі каля Салдацкага возера, што на Энцы, з'явіўся гаспадар. Мясцовая прыватная прадпрымальніца месяц таму ўзяла ў арэнду тэрыторыю плошчай шэсць сотак каля возера.

Сёння там будуецца невялікі гандлёвы павільён, дзе потым можна будзе набыць розныя прадукты і напоі. Перад павільёнам размесціцца пляцоўка са столікамі. Непадалёку гаспадыня ўстановіць два туалеты і бак для смецця. Усё гэта будзе зроблена дзесьці праз два тыдні. Але гэтымі намаганнямі добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол возера не вырашыцца, бо даглядацца будуць толькі гэтыя шэсць сотак, і не болей. Толькі ў тым выпадку, калі справы пойдуць добра, новая гаспадыня будзе думаць пра пашырэнне арандаванай тэрыторыі.

Антон ТРАФІМОВІЧ

ЭТО ИНТЕРЕСНО

НЕИЗВЕСТНЫЙ АЛЬБЕРТИНСКИЙ КАМЕНЬ


Фота Аляксандра ЗАХАРАНКІ
■ Камень-загадка в Альбертине

На одной из полянок альбертинского леса, что находится недалеко от жилых домов, лежит интересный камень. Он практически врос в землю.

На камне высечена дата – 1892, с двух ее сторон – буквы Z, E, S, а также два направленных в разные стороны якоря и православный крест.

Согласно «Энциклопедии археологии и нумизматики Беларуси», на территории нашего государства имеется несколько разновидностей валунов. Это камни с надписями, с углублениями, со знаками, «чертовые» камни, камни-швеи и камни-следовики. Лежащий в Альбертине камень скорее всего относится к камням со знаками. Они являются памятниками археологии и палеографии и связаны с культами. На них нанесены различные по форме и размерам кресты, а также кресты в сочетании с буквами и надписями. На таких валунах бывают высечены монограммы, стрелки, подковы и всевозможные рисунки.

В энциклопедии указаны места нахождения и наибольшего распространения таких камней. Кроме того, указано их количество. В Гродненской области имеется несколько валунов с одним крестом (Лидский и Новогрудский районы), а также с крестом в сочетании с буквами (Дятловский и Ивьевский районы). Камни с высеченными на них рисунками известны в Щучинском районе.

А вот что касается камня в Альбертине, то о нем, к сожалению, нигде не упоминается. Поэтому эту загадку хочется адресовать белорусским ученым-археологам.

Александр ЗАХАРЕНКО

ПОЛИТИКА

БЕЛОРУСЫ ПРОТИВ ТРЕТЬЕГО СРОКА

В минувшие выходные в Гродно, Волковыске и Витебске прошел альтернативный референдум, организованный активистами ОГП.

Главный и единственный вопрос, ответить на который было предложено жителям этих городов, заключался в следующем: «Согласны ли Вы с тем, чтобы одно и то же лицо занимало президентский пост более 2 сроков подряд?» Из 3 922 человек, принявших участие в импровизированном голосовании, против третьего срока высказались 3 613. Это составило 92,12% от общего числа, принявших участие в референдуме.

«Голосование проводилось по всем правилам избирательного кодекса. Бюллетени опускались в опечатанную урну, голосование было тайным, подсчет голосов проходил в присутствии наблюдателей», – рассказал в интервью пресс-службе ОГП координатор акции, член Политсовета Объединенной гражданской партии Алесь Корниенко.

Данная акция вызвала соответствующий резонанс у правоохранительных органов. В субботу, 26 июня, на Центральном рынке Гродно во время проведения процедуры голосования были задержаны активисты ОГП Вадим Иодель, Евгений Лукша, Виталий Филиппович. Все трое доставлены в Октябрьский РОВД, где был составлен соответствующий протокол об их задержании. Им также вручены повестки с требованием явиться в Октябрьский РОВД города Гродно.

Пресс-служба ОГП, www.ucpb.org

СКАНДАЛ

СЛЕДСТВА ПАЧЫНАЕЦЦА

Некаторы час таму "ГС" друкавала матэрыял пра тое, што ля вёскі Навінка Мастоўскага раёна на старыцы Нёмана відэакамерай быў зафіксаваны факт незаконнай лоўлі рыбы падчас нерасту дырэктарам мясцовай паляўніча-рыбнай гаспадаркі М. Тумашчыкам і іншымі асобамі, якія маюць дачыненне да аховы прыроды.

Відэакасету перадалі ў інспекцыю па ахове прыродных рэсурсаў пры прэзідэнце РБ. Матэрыялы пра гэта друкаваліся ў газетах "Советская Белоруссия" і "Згода". Затым відэафакт перадалі старшыні райвыканкама Віктару Кудзелю, а ў мясцовую пракуратуру паступіла заява ад прыватнай асобы з патрабаваннем разабрацца, ці з'яўляюцца гэтыя дзеянні парушэннем артыкула закона.

Заяву пераадрасавалі ў мясцовы РАУС. Праверку яе даручылі следчаму Андрэю Александровічу. Праз некаторы час з сабранымі дакументамі яго выклікалі ў Гродна. Нягледзячы на тое, што ўдзельнікі зафіксаванага факта свае паводзіны тлумачаць змаганнем з браканьерамі, было прынята рашэнне аб правядзенні следства.

На сёння Мікалай Тумашчык часова адлучаны ад пасады дырэктара, а яго месца заняў Аляксандр Дубатоўка. Да гэтага часу не было вядома, хто праводзіў відэаздымкі. Цяпер следству падалі прозвішчы аператараў. Гэта чацвёра мастоўцаў, якія гатовы даць сведчанні. Згодна з іх словамі, перад тым як зафіксаваць гэты факт, яны некалькі дзён назіралі за дзеяннямі ахоўнікаў прыроды.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ТРУДОВОЙ СЕМЕСТР

СТУДЕНТЫ РЕШИЛИ ПОРАБОТАТЬ

Около 60 студенческих строительных отрядов, насчитывающих до 1,5 тысячи молодых людей, создано в этом году в Гродненской области.

Всех их можно условно разделить на три основные группы: волонтерские, строительные и сельскохозяйственные. Они будут работать там, где действительно необходимы молодые руки. Уже благодаря им благоустраиваются физкультурно-оздоровительные комплексы, жилые дома микрорайонов, гродненский стадион "Неман", Августовский канал. Одиннадцати гродненским студентам посчастливилось войти в состав сводного педагогического отряда, который отправился в Анапу. Туда же, на юг, поедет и сборный студотряд "Беларусь".

Александр ХИЛИМОН

ПОД СЛЕДСТВИЕМ

ДЕТИ И ЖЕНА ВАЛЕРИЯ ЛЕВОНЕВСКОГО ОТКАЗАЛИСЬ ДАВАТЬ ПОКАЗАНИЯ

24 июня в Ленинскую прокуратуру Гродно вызвали детей и жену Валерия Левоневского – для дачи показаний в качестве свидетелей по уголовному делу о публичном оскорблении Александра Лукашенко.

Обвиняемыми по этому делу являются сам руководитель стачкома предпринимателей страны и участник Европейской Коалиции «Свабодная Беларусь» Валерий Левоневский, который находится в гродненском следственном изоляторе, и его заместитель Александр Васильев.

Следователь прокуратуры сказал Левоневским, что они могут отказаться давать показания против своих родственников. Поэтому все они: сыновья Валерия – Дмитрий, Владимир, дочь Екатерина и жена Марина – использовали эту возможность и давать показания отказались.

Дмитрий и Владимир несколько дней назад подали в прокуратуру письменную просьбу о свидании с отцом, но разрешения пока не получили. Следователь Альфред Танкевич также не дал парням конкретного ответа на вопрос, когда такая встреча состоится. До этого свидание в следственном изоляторе имела только Марина Левоневская.

Радыё Свабода

НАВІНЫ

ПРАСТЫТУТАК І СУТЭНЁРАЎ ПАДЛІЧЫЛІ

ГРОДНА. У гэтым годзе ў Гродзенскай вобласці налічваецца звыш 470 асобаў, якія займаюцца прастытуцыяй, крыху больш за 20 – сутэнёраў і зводнікаў.

Вярбоўкай і гандлем жанчынамі займаюцца 16 чалавек, утрыманнем прытонаў – 12.

З пачатку года за занятак прастытуцыяй складзена 200 пратаколаў і 7 – за распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў.

Міліцэйская статыстыка таксама папоўнілася 50 злачынствамі ў галіне нораваў.

Падбор жанчын для сексуальнай эксплуатацыі адбываецца практычна ва ўсіх гарадах вобласці, але найбольш – у Гродне, Шчучыне, Свіслачы, Бераставіцы, Смаргоні, Слоніме, Лідзе, Ваўкавыску і Ашмянах.

Найчасцей "жывы тавар" з Гродзеншчыны вывозяць у Расію, Італію, Польшчу, Германію, Аўстрыю, Іспанію і Турцыю.

Пра гэта паведаміла газета "Міліцэйскі веснік".

Мікола КАНАНОВІЧ

ДЕВОЧКА ПОГИБЛА ВО ВРЕМЯ ПОЖАРА

БЕРЕСТОВИЦА. Трехлетняя девочка погибла 25 июня во время пожара в деревне Шелетки Берестовицкого района, ее старший брат спасен бойцами МЧС.

Как сообщает пресс-служба МЧС, пожар в жилом доме, принадлежащем 26-летней женщине, жители деревни заметили около трех часов пополудни. В доме без присмотра оставались дети хозяйки – трехлетняя Эльвира и пятилетний Олег. Сама она находилась в соседней деревне.

Спустя три минуты после вызова к месту пожара прибыло первое подразделение МЧС. Возле входной двери спасатели обнаружили мальчика, вынесли его на улицу и передали медикам. Ребенок с симптомами отравления угарным газом был доставлен в больницу. Сейчас его жизнь вне опасности.

Девочку же спасти не удалось – она погибла в результате отравления продуктами горения.

Огонь повредил около 30 квадратных метров кровли жилого дома, имущество на кухне.

Причина пожара устанавливается.

Дмитрий БЕЛЬСКИЙ

СЫН ПРАЛАМАЎ ГАЛАВУ БАЦЬКУ

ЗЭЛЬВА. Беспрацоўны 42-гадовы жыхар вёскі Задвор'е падчас сваркі на падворку дома стукнуў кіем па галаве роднага бацьку.

У выніку гэтага, адзначае газета "Міліцэйскі веснік", 70-гадовы пенсіянер з адкрытай чэрапна-мазгавой траўмай і гематомай мозга змешчаны ў бальніцу.

Мікола КАНАНОВІЧ

СУД АДХІЛІЎ СКАРГУ МІКОЛЫ МАРКЕВІЧА

ГРОДНА. Галоўны рэдактар газеты "День" Мікола Маркевіч падаў скаргу на рашэнне адміністрацыйнай камісіі, якая пакарала яго нібыта за распаўсюд друкаваных выданняў без выходных звестак. Суддзя Ганна Чылека ў Ленінскім раённым судзе Гродна днямі разгледзела скаргу і адхіліла яе.

Нагадаем, што на пачатку красавіка на шашы Мінск–Гродна на іўеўскім пасту дарожнай міліцыі канфіскавалі наклад газеты "День". Месяц таму адміністрацыйная камісія Ленінскага раёна аштрафавала Міколу Маркевіча на 19 тысяч рублёў і ўзаконіла канфіскацыю газетнага накладу.

Мікола Маркевіч папрасіў суд скасаваць рашэнне адміністрацыйнай камісіі, спасылаўшыся на тое, што ніякага правапарушэння з ягонага боку не было.

Радыё Свабода

СЕЛО


Фота photo.bymedia.net

■ Так выглядят меxдворы многих колхозов

НЕТ ЖЕЛАЮЩИХ ВЛАДЕТЬ КОЛХОЗОМ

Ни один предприниматель не пожелал пока стать собственником колхоза с так называемым "критическим уровнем экономики" в Гродненской области.

Инвестиционного энтузиазма у деловых кругов не вызвали даже налоговые послабления в виде трехлетней отсрочки выплат по банковским кредитам, беспошлинной покупки сельхозтехники и отсрочки долгов по энергоресурсам до 2009 года, предусмотренные недавним указом президента "О порядке и условиях продажи юридическим лицам предприятий как имущественных комплексов убыточных сельскохозяйственных организаций".

Как отметила в интервью БелаПАН заведующая сектором по реформированию предприятий АПК комитета по сельскому хозяйству Гродненского облисполкома Регина Гончарук, предприниматели пока только декларируют свои инвестиционные намерения.

Хотя в Гродненской области из 273 сельхозпредприятий 93 считаются убыточными, на сегодняшний день лишь две коммерческие фирмы – из Дятловского и Лидского районов – прицениваются к нерентабельным колхозам. Столь низкий интерес инвесторов к сельхозпроизводству специалисты объясняют низкой окупаемостью вкладываемых средств и их медленной оборачиваемостью.

Впрочем, даже если области не грозит повальная продажа подобных хозяйств, половина из них сможет подняться на ноги, считает Регина Гончарук.

В этом направлении, по ее словам, есть уже проверенный путь – присоединение слабых хозяйств к экономически сильным, а также "шефство" благополучных промышленных предприятий в виде финансовой и другой помощи.

Александр ХИЛИМОН

СКАНДАЛ

ТАДЭВУША ГАВІНА ПАЗБАВІЛІ ЗВАННЯ ГАНАРОВАГА СТАРШЫНІ САЮЗА ПАЛЯКАЎ

Стваральнік Саюза палякаў у Беларусі Тадэвуш Гавін пазбаўлены звання ганаровага старшыні гэтай грамадскай арганізацыі. За гэта прагаласавала Рада Саюза, а ініцыятыва зыходзіла ад Міністэрства юстыцыі. Званне ганаровага старшыні спадару Гавіну надаў пяты надзвычайны з'езд СПБ, які адбыўся 3,5 гады таму.

Сам Тадэвуш Гавін не прысутнічаў на пасяджэнні Рады, бо яму не паведамілі, што будуць разглядаць гэтае пытанне. Ён лічыць, што ягонай асобай раптам зацікавіліся таму, што ён хоча ўдзельнічаць у выбарах у Палату прадстаўнікоў. А ў яго акрузе, гаворыць ён, збіраецца вылучацца начальнік абласной міліцыі. Дарэчы, дэпутатам ад гэтай Гродзенскай сельскай акругі цяпер з'яўляецца генерал Валерый Фралоў.

Сам Тадэвуш Гавін адмовіўся каментаваць рашэнне наконт сябе, прынятае Радай Саюза палякаў. Сваю думку Радыё Свабода выказаў сябра кантрольна-рэвізійнай камісіі Саюза палякаў Андрэй Кусяльчук:



■ Тадэвуш Гавін

– Я абураны ўсім, што адбываецца на сённяшні момант у Саюзе палякаў. Усіх паправак, дапаўненняў да статута, прынятых на апошнім з'ездзе, не ўлічылі і не ўнеслі ў статут. Як я даведаўся, былы старшыня Саюза палякаў, абраны на апошнім з'ездзе ганаровым старшынёй, ужо не з'яўляецца ім, таму што адпаведных паправак у статут таксама не ўнеслі. Мне здаецца, гэта не толькі для яго асабістая абраза.

Андрэй Кусяльчук зазначае, што, дзякуючы намаганням Тадэвуша Гавіна, пабудавалі дзве школы з польскай мовай навучання і ўвогуле ён шмат зрабіў для беларускіх палякаў. Нездарма сябры апошняга з'езду надалі яму званне ганаровага старшыні.

Намеснік старшыні Саюза палякаў Юзаф Пажэцкі сказаў, што не хоча каментаваць рашэнне Рады наконт Тадэвуша Гавіна. Але паведаміў, што сам галасаваў супраць пазбаўлення яго звання ганаровага старшыні. Аднак большая частка з 18 сябраў Рады падтрымала патрабаванне начальніка ўправы грамадскіх аб'яднанняў міністэрства спадара Сухініна, які ў сваім лісце фактычна патрабаваў скасаваць званне ганаровага старшыні.

Паводле Юзафа Пажэцкага, кіраўніцтва Саюза палякаў два месяцы таму даслала ў Міністэрства юстыцыі для зацвярджэння папраўкі да свайго статуту, прынятыя апошнім з'ездам тры з паловай гады таму. Але папраўкі наконт "ганаровага старшыні" для зацверджання міністэрству не прапанавалі.

Радыё Свабода

НОВОСТИ

ШКОЛЬНИКИ ИЗУЧАЛИ НОВЫЙ КУРС

ГРОДНО. 205 гродненских школьников впервые в этом учебном году изучали новый курс "Гродноведение", который им преподавали на занятиях в Гродненском государственном историко-археологическом музее сотрудники этого учреждения.

Об этом корреспонденту БелТА сообщила заместитель директора по научной работе музея Валентина Царук.

По ее словам, пока в эксперименте участвовали только ученики младших классов средней школы №5. Чтобы история Гродно была понятна и интересна его маленьким жителям, использовали наглядный материал. Это экспонаты музея, а также документы хранилищ и фондов.

Над программой предложенного курса несколько лет работал коллектив музея. Всего в нынешнем учебном году проведено более 80 занятий, посвященных истории Гродно, архитектурным памятникам областного центра, известным писателям и общественным деятелям, жившим в городе над Неманом, развитию народных промыслов.

Курс "Гродноведение" будет продолжен в новом учебном году. Изучать историю родного города смогут учащиеся не только младших, но и старших классов средней школы №5 и некоторых других школ областного центра, сообщила Валентина Царук.

ОБЩЕСТВЕННОСТЬ ГРОДНО СОЗДАЁТ МУЗЕЙ ВАСИЛЯ БЫКОВА

ГРОДНО. В Гродно усилиями местной общественности создается музей Василя Быкова. Городское общественное объединение ветеранов войны, труда и вооруженных сил не раз обращалось к властям города с ходатайством об увековечении памяти народного писателя Беларуси, который, как известно, долгое время жил и работал в Гродно. В частности, они предлагали переименовать бульвар Ленинского комсомола, назвать одну из школ именем писателя, основать ежегодную премию имени Быкова в области литературы и журналистики, посмертно присвоить писателю звание почетного гражданина Гродно, открыть его музей. Ни одно из этих предложений не было поддержано властями.

Тогда объединение ветеранов решило действовать самостоятельно. В помещение своего офиса, площадь которого составляет 20 квадратных метров, они начали сносить различные издания произведений Василя Быкова, публикации и воспоминания о нем, альбомы, граммофонные записи с выступлениями писателя. Постепенно офис организации начал превращаться в музей.

Сегодня здесь, помимо перечисленного, можно увидеть рукописи и фотографии Василя Быкова, полное собрание сочинений писателя, книги из его личной библиотеки и другие принадлежавшие ему вещи, подаренные родственниками. На пожертвования гродненских предпринимателей и банков куплены два стенда для размещения экспонатов музея.

БелаПАН

САМЫЙ БОГАТЫЙ ЖИТЕЛЬ ОБЛАСТИ

ГРОДНО. Более 14 тысяч жителей Гродненской области задекларировали свои доходы за 2003 год.

По данным областной инспекции Министерства по налогам и сборам, максимальная ставка – 30 процентов от суммы совокупного годового дохода – применена в отношении 362 граждан, проживающих в регионе. Таким образом, этих людей можно отнести к самым богатым жителям области – за год они заработали более 20 миллионов рублей.

Наибольшую сумму совокупного годового дохода – 5 миллиардов 35 миллионов 126 тысяч рублей (2 млн. 337,5 тыс. долларов США) – представил индивидуальный предприниматель. А наибольшая сумма, задекларированная физическим лицом (не предпринимателем), составила порядка 38 миллионов (17,6 тыс. дол.).

Сокрытый, но выявленный доход, который пытались утаить все категории работающих, в сумме превысил 15 миллионов рублей.

Александр ХИЛИМОН

ГАБАРЫТЫ НЕ ДАЗВОЛІЛІ

МАСТЫ. У вёсцы Левыя Масты кіроўца аўтацягача, які перавозіў экскаватар, пры ўездзе на мост праз Нёман не выканаў патрабаванняў габарытаў вышыні грузу. Коўш экскаватара зачапіў за абгараджальную перакладзіну і збіў яе. На некаторы час быў спынены рух.

АЎТАМАБІЛЕМ ПА ГАДЗІННІКАХ

МАСТЫ. Рухаючыся па вуліцы Савецкай, уладальнік легкавога аўтамабіля не справіўся з кіраваннем і стукнуўся ў прыватны шапік, дзе рамантуюцца гадзіннікі. У выніку сутыкнення як шапік, так і легкавік набылі пашкоджанні.

ДОСТУП ДА ІНТЭРНЕТУ ПАШЫРЫЎСЯ

МАСТЫ. Пасля капітальнага рамонту і пераабсталявання актавай залы раённага вузла электрасувязі тут размясцілася камп'ютэрная зала, дзе мастоўцы атрымалі доступ да Інтэрнету. Гэта першая ўстанова ў горадзе, якая аказвае такі від паслуг. Іншыя шэсць камп'ютэрных клубаў прыватныя, яны прадастаўляюць юным гараджанам забаўляльныя гульні.

Акрамя гэтага, сюды перамясціліся тэлеграф, майстэрня па рамонце тэлефонных апаратаў і іншыя службы сувязістаў.

Антон МАКЕЙ

ЭКОНОМИКА

КАКОВ ПОЛИТИЧЕСКИЙ КУРС БЕЛОРУССКОГО РУБЛЯ?

Белорусский Нацбанк сохраняет привязку к российскому рублю. И планирует, что к 1 января 2006 года курс белорусского рубля составит 76,85–78,40 к российскому и 2 230–2 300 к доллару.

Об этом сказано в доработанном проекте Основных направлений денежно-кредитной политики на 2005 год, который в понедельник, 21 июня, направлен на рассмотрение Совета министров.

Таким образом, девальвация национальной валюты к российскому рублю в 2005 г. не превысит 2%, а к доллару – 3%.

Реален ли этот план? Эксперт НИСЭПИ Валерий Дашкевич отмечает, что нынешняя экономическая ситуация вполне позволяет строить такие прогнозы. "Мы наблюдаем благоприятную внешнеторговую ситуацию. Экспорт белорусских товаров растет. Граждане Беларуси охотно доверяют банкам свои рублевые сбережения, и потому Нацбанку будет легко удержать любой желаемый курс", – сообщил эксперт. Он подчеркнул также, что сдерживание обменного курса помогает бороться с инфляцией, так как в этом случае издержки на сырье и комплектующие растут медленнее.

Аналитик уверен, что "власти будут стремиться удержать уровень процентных ставок по рублевым депозитам на привлекательном для населения уровне". То есть если предположить, что инфляция выйдет на уровень в 15%, ставки по вкладам в национальной валюте будут на уровне 17–18% или выше. При этом Нацбанк окажется в центре конфликта интересов, выполняя еще одну стратегическую задачу – удешевления кредитов для предприятий, отметил В. Дашкевич.

Если произойдет резкое снижение ставок кредита, то будут снижены и ставки по вкладам. А значит, белорусские граждане могут привычно переориентироваться на иностранную валюту как на основной способ сохранения сбережений.

Если же резко вырастет спрос на зарубежные денежные средства (будь то доллар, евро или что-то еще), то главный банк страны окажется перед сильным соблазном – провести девальвацию, чтобы заработать побольше на продаже СКВ.



■ Курс белорусского рубля падать не будет

— Па-рознаму. Калі я толькі прыйшла ў вучылішча, дзеці, калі адказвалі на ўроках, не маглі выказаць свае думкі па-руску, ім лепш было адказваць на роднай мове. Цяпер назіраецца іншая тэндэнцыя — вясковыя дзяўчынкі хочуць хутка абрусець. І атрымліваецца даволі смешна. Як некалі ў савецкі час. Але калі праводзіцца якая-небудзь імпрэза і яна павінна праходзіць на роднай мове — праблем не існуе. Дзеці мову ведаюць, а вось размаўляць саромеюцца ці проста не хочуць быць "белымі варонамі". А можа, і не могуць правільна размаўляць. Усё ж большая частка іх гаворыць па-тутэйшаму, як у той ці іншай вёсцы альбо ў іх раённым цэнтры.

— Ці праводзіце вы ў вучылішчы імпрэзы па праблемах і вывучэнню роднай мовы, літаратуры, гісторыі?

— Беларуская мова ў нас вывучаецца толькі на першым курсе, а пасля — беларуская літаратура. З самага пачатку я сярод першакурснікаў праводжу анкету наконт адносінаў да роднай мовы. Амаль усе дзеці пішуць, што мова родная нам вельмі патрэбна, што мова нам дадзена Богам, што без мовы няма народа. Але ёсць і такія навучэнцы, якія разважаюць, што беларуская мова нам зусім не патрэбна, хопіць адной рускай. Але лёс роднай мовы і Беларусі іх хвалюе. У гэтым годзе я праводзіла дыспуты на тэму "Мова ў жыцці і грамадстве", "Праблемы мовы" і іншыя імпрэзы. А пасля "Беларускіх вячорак" дзяўчаты хацелі правесці новыя падобныя мерапрыемствы. Так ім яны спадабаліся.

— Што чытаюць, напрыклад, вашы навучэнкі, якія жывуць у інтэрнаце?

— Дзеці чытаюць вельмі мала. Беларускія кнігі чытаюцца толькі тыя, якія ім неабходны па праграме. Нядаўна вывучалі мы раман "Людзі на балоце" Івана Мележа. Амаль ніхто з дзяцей трох гэтых кніг не прачытаў. Ну хаця б прачыталі першую. Не. Не падабаецца ім Мележ, і ўсё. Пераважна чытаюць дзеці часопісы, газеты, разгадваюць сканворды і красворды.

— А ці ведае моладзь свой куток, горад, раён, адкуль яны родам?

— Ведаюць добра. На ўроках сучаснай беларускай літаратуры мы вывучаем творчасць сваіх землякоў. Адна дзяўчынка з Дзятлаўскага раёна напісала вельмі цікавы і змястоўны рэферат пра Ігната Дварчаніна. Я проста была здзіўлена.

— Алена Валер'еўна, я чуў, што вы са сваімі навучэнкамі грунтоўна даследавалі літаратурную Слонімшчыну...

— Справу мы зрабілі вялікую. Сабралі цікавыя звесткі пра слонімскіх літаратараў, якія нарадзіліся і жылі тут у розны час. Афармілі карту, намалявалі літаратурнае дрэва, зрабілі альбом на гэтую тэму. На нашым узроўні атрымалася даволі сур'ёзная праца. Хаця мы з дзецьмі нічога новага па гэтай тэме не адкрылі, але адну задачу выканалі — сабралі багата звестак пра нашых літаратараў-землякоў. Калі б былі ў нас сродкі, мы з навучэнцамі праехалі б па ўсіх літаратурных мясцінах, правялі б шыкоўныя вечарыны, сустрэчы. А так робім тое, на што ў нас хапае сіл і сродкаў.

— А ці патрэбна ў такіх прафтэхвучылішчах выкладанне роднай мовы і літаратуры? І наогул гуманітарных дысцыплін?

— Абавязкова патрэбна. І колькасць гадзін на родную мову і літаратуру трэба павялічваць. Цяпер на першым курсе на вывучэнне беларускай мовы адведзена 56 гадзін і літаратуры таксама 56 гадзін. На другім курсе вывучаецца толькі літаратура — 58 гадзін. Гэтага мала. І якіх бы мы спецыялістаў ні рыхтавалі — яны павінны ведаць родную мову, гісторыю сваёй краіны і выхоўвацца на добрых справах і традыцыях сваіх землякоў. ▪

СУСЕДЗІ

ЖЫЦЦЁВЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ, ці ШКОЛА БУДУЧЫНІ

▪ Яніна МЕЛЬНІКАВА,
Варшава

Карэспандэнт "ГС" наведала адну з варшаўскіх школ, якую з упэўненасцю можна назваць сапраўдным жыццёвым універсітэтам.

Аб'яднанне грамадскіх агульнаадукацыйных школ "Беднарская" — гэта гімназія і ліцэй. Гэтая школа вядомая сваімі прынцыпамі талерантнасці і роўнага падыходу да ўсіх. Таму тут вучацца дзеці не толькі заможных палякаў (навучанне ў школе платнае), але і дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама дзеці бежанцаў з Кітая, Афганістана, Чачні. У школу прымаюць усіх, хто скончыў пачатковую школу і мае 13 гадоў.

Дарэчы, адукацыйная сістэма Польшчы выглядае наступным чынам. Спачатку садок (з 3 да 7 гадоў), пачатковая школа (6 класаў), потым гімназія (3 класы) і ліцэй (яшчэ 3 класы). Такім чынам, у школе польскія дзеці праводзяць 9–12 гадоў, у залежнасці ад таго, што плануюць рабіць далей. Калі ў планах вышэйшая навучальная ўстанова, без ліцэя не абысціся. Толькі пасля яго заканчэння можна здаваць матуру, экзамен на атэстат сталасці.

Сярод большай часткі не толькі беларускіх, але і польскіх школ "Беднарская" — асаблівая. У школе ніхто не змагаецца за найвышэйшыя балы, ніхто не патрабуе штодзённага поспеху. Тут забараняецца ставіць вучня ля дошкі, апытваць без папярэджання. Тут ніколі не паставяць двойкі за тое, што нечага не ведаеш. Настаўнікі тут не пішуць штодзённых планаў, а класны журнал запаўняюць рознымі колерамі.

Але галоўнай асаблівасцю школы з'яўляецца не ўсё гэта разам узятае, а імкненне настаўнікаў выхоўваць дзяцей згодна з дэмакратычнымі прынцыпамі. Яны перакананы, што найлепшым спосабам для дасягнення гэтай мэты з'яўляецца ўласная актыўнасць у дэмакратычных структурах.

Для гэтага школьная супольнасць арганізавана як маленькая дэмакратычная дзяржава. Грамадзяне Рэчы Паспалітай Школьнай — вучні, бацькі, настаўнікі і выпускнікі. Закон школы — Канстытуцыя, якую прыняў Сейм першага склікання колькі гадоў таму. Сеймы наступных скліканняў толькі робяць карэктывы, распрацоўваюць у залежнасці ад неабходнасці новыя законы.

Школьная ўлада — Сейм (заканадаўчая), Рада Школы (выканаўчая) і незалежны Суд (судовая). Усё як у сапраўднай дзяржаве. Выбары ва ўсе галіны ўлады адбываюцца штогод, праходзяць з агітацыяй, праграмамі кандыдатаў, тайным галасаваннем і запячатанымі урнамі. Ва ўсіх дзяржаўных структурах — роўная колькасць вучняў, настаўнікаў і бацькоў. Напрыклад, школьны Сейм складаецца з 63 паслоў: па 20 — ад вучняў, бацькоў, настаўнікаў і трое — ад выпускнікоў. Рашэннямі Сейма ўносяцца змены ў Канстытуцыю. Правы іх разгляду маюць не толькі паслы, дырэктар, Рада настаўнікаў ці Рада Школы, але і самі вучні (больш за 15 чалавек). Апошні прыклад заканатворчасці — закон аб барацьбе з ужываннем наркотыкаў.

Яго мэтай было абмежаваць гэтую з'яву, не даць вучням і настаўнікам (!) спакусіцца, каб паспрабаваць нешта такое не толькі ў сценах школы, але і па-за ёй. Спрэчак было шмат, але ў выніку вырашылі, што кожны вучань школы некалькі разоў на год павінен... здаць аналіз на ўжыванне наркотыкаў. Ніхто не ведае, калі гэта будзе, ніхто не ведае, каго выберуць гэтым разам. Вынікі аналізаў ведае толькі дырэктар школы, якая, у выпадку калі аналіз дрэнны, падпісвае з вучнем кантракт. У кантракце — абавязак ніколі больш не ўжываць ніякіх псіхатропных рэчываў і здаваць аналіз кожны месяц. Парушыў дамову — адбяруць грамадзянства і дэпартуюць.

Школьны суд — трое чалавек (вучань, настаўнік і бацька). Да іх прыходзяць са скаргамі ўсе грамадзяне Рэчы Паспалітай Школьнай без выключэння, калі справу не ўдаецца ўрэгуляваць мірным шляхам. У судзе працуюць пракуроры і адвакаты. Рашэнні суда канчатковыя і абскарджанню не падлягаюць. Нават дырэктар школы не можа іх змяніць. Выбар пакаранняў розны: ад грамадскай працы да выключэння са школы.

Мае "Беднарская" і свае грошы — "бернары". Прыбіральшчыц у Рэчы Паспалітай Школьнай няма, таму вучні робяць гэта самі, за што атрымліваюць грошы. Атрымаць "бернары" можна і за карысную працу, правядзенне школьных свят і іншае. У канцы навучальнага года кожны грамадзянін павінен здаць у казну 145 "бернараў", каб атрымаць ліст з адзнакамі. Былі выпадкі, калі заможныя вучні куплялі ў працавітых "бернары", але пра гэта даведаўся Сейм. Цяпер такі торг па-за законам. ▪



▪ З самай раніцы зэльвенцы спяшаліся на кірмаш



▪ Гуляць дык гуляць...



▪ Не стрымаць украінскага верхавога каня

АННЕНСКІ КІРМАШ ПРАЙШОЎ У ЗЭЛЬВЕ

▪ Сяргей ЧЫГРЫН

У нядзелю, 27 чэрвеня, у Зэльве адбылося абласное свята "Анненскі кірмаш". Менавіта так у XVIII – канцы XIX стагоддзяў называўся кірмаш, які праславіў Зэльву на ўсю Еўропу.

Прычынай гэтага стаў прывілей вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Аўгуста II ад 20 траўня 1721 года, які атрымаў Антоні Казімір Сапега на правядзенне ў Зэльве з 25 ліпеня да 25 жніўня штогадовых Анненскіх (у гонар святой Анны) кірмашоў.

На зэльвенскі кірмаш з'язджаліся гандляры з многіх беларускіх гарадоў і мястэчак, а таксама з Польшчы, Прыбалтыкі, Украіны, Расіі, Аўстрыі, Прусіі, Італіі, Даніі, Швецыі і з іншых дзяржаў.

На дастаўку тавараў гужам з Масквы ў Зэльву патрабавалася тры дні, з Ніжняга Ноўгарада – месяц, з Варшавы – 10–15 дзён, з Гродна – 2–3 сутак. Вось як пісаў вядомы польскі пісьменнік Юзаф Крашэўскі пра Анненскі кірмаш у Зэльве: "З вельмі даўніх часоў Зэльва і яе жыхары падпарадкоўваліся дзіўнаму правілу – калі адзінаццаць месяцаў у годзе яны марнеюць, то толькі месяц жывуць".

Што ж прывозілі купцы ў Зэльву? Напрыклад, з Расіі яны прыязджалі першымі і прывозілі футра, жалеза, шкло, прыганялі коней. Украінскія купцы, а таксама гандляры з балканскіх краін прывозілі віно, розныя бакалейныя вырабы, масла, тытунь, чай, каву. Прыганялі яны і коней, якія карысталіся вялікім попытам у пакупнікоў. Дарэчы, конскі торг – адна з характэрных рыс зэльвенскага кірмашу. У асобныя гады там прадавалі па некалькі тысяч коней. У 1840 годзе іх было прададзена на 6 074 рублі серабром. Гэта былі коні пераважна з Расіі. Гандляры з далёкіх паўднёва-ўсходніх краін, якіх у пачатку 20-х гадоў XIX стагоддзя абклалі вялікімі мытнымі пошлінамі, прывозілі ўсё менш сваіх тавараў. Справа ў тым, што іх дарагія тавары выцясняла прадукцыя расійскіх і польскіх, а таксама мясцовых мануфактур.

Вялікім поспехам карысталася сукно Слонімскай суконнай фабрыкі сенатара Навасільцава. У ведамасці ваўкавыскага земскага спраўніка Гродзенскай губерні пра зэльвенскі кірмаш 1830 года ёсць нават спецыяльная заўвага, дзе гаворыцца, што сукна было прададзена больш за палавіну і найлепшае – было з фабрыкі сенатара Навасільцава са Слоніма.

Кірмаш у Зэльве з'яўляўся не толькі гандлёвым цэнтрам, але і месцам забаўляння, адпачынку. Тут быў тэатр, які належаў Сапегам. Сюды прыязджалі тэатральныя калектывы з Парыжа, Варшавы і Вільні. Выступалі жанглёры, фокуснікі, цыганы з дрэсіраванымі мядзведзямі.

Асаблівай папулярнасцю на кірмашы карысталася гульня ў рулетку. Яна прыцягвала ў Зэльву вялікую колькасць багатых людзей, чыноўнікаў, усіх аматараў "вострых" пачуццяў.

Прадаўшы тавар, гандляры пачыналі замочку ў рэстаранах, пасля ў начной карчме, дзе іх чакалі поўныя наборы начных забаў: ад музыкі да стрыптызу. Для таго часу Анненскі кірмаш меў і дзве асобныя прывілеі. Першая з іх заключалася ў праве курэння цыгар і трубак не толькі ў карчмах, але на вуліцах, у крамах і нават у тэатры. Другая – у свабодзе апранацца так, як хочацца...

З 15 жніўня адкрываўся кірмаш у Свіслачы. І купцы, зацікаўленыя ў новых пакупніках, перавозілі свае нераспраданыя тавары з Зэльвы ў Свіслач. Але свіслацкі кірмаш ніколі не рабіў такіх багатых і вялікіх збораў, як зэльвенскі. Гэта, напэўна, можна растлумачыць тым, што ён у нейкай ступені быў як бы працягам Анненскага кірмашу, апошнім яго акордам.

З таго часу прайшло больш за стагоддзе. Але нагадала пра зэльвенскі славуты кірмаш упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама сумесна з Зэльвенскім райвыканкамам тры гады таму, калі ў Зэльве ўпершыню прайшло гэтае вялікае абласное свята. Цяпер яно стала традыцыйным. І свята збірае ў Зэльве тысячы людзей.

Сёлетні Вялікі Анненскі кірмаш пачаўся на цэнтральнай плошчы пасёлка. Свята віталі мясцовыя акцёры ў вобразах князя Сапегі і яго світы, а таксама тэатралізаваны паказ "Кірмашовая карусель". Урачыстасць адкрыў старшыня Зэльвенскага райвыканкама Леанід Эльяшэвіч, які прыгадаў гісторыю Анненскага кірмашу і пажадаў усім добрага адпачынку. На свята таксама прыехалі намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова і супрацоўнікі ўпраўлення культуры аблвыканкама.

Калі над цэнтральнай плошчай Зэльвы ўзвіўся сцяг свята, пачаўся вялікі канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці. Спявалі "Бераставіцкія музыкі", народны ансамбль музыкі "Славяначка" з Кастровіцкага сельскага Дома культуры Слонімскага раёна, народны ансамбль "Святлана" са Стоўбцаўскага раёна, дзяржаўны ансамбль "Белыя росы", лаўрэаты пятага фестывалю Нацыянальных культур Рада і Лідзія Хаменкі з Гомельшчыны і іншыя выканаўцы.

З цэнтры плошчы Зэльвы свята разышлося па ўсім пасёлку. У скверыку людзі знаёміліся з выставай творчасці мясцовых мастакоў – абразамі Марыі Харытончык, карцінамі Яўгена Кунцэвіча, Максіма Чыжэўскага, Наталлі Дарафей, Івана Васюкевіча і партрэтамі, намаляванымі алоўкам, мастачкі Святланы Ліпскай.

Цікава прайшла канцэртна-забаўляльная праграма "Ад спеваў да жартаў". Тут спаборнічалі паміж сабою гарманісты, прыпевачнікі і тыя, хто ведаў і ўмее расказваць шляхецкія анекдоты.

Пасля абеду свята працягвалася на стадыёне "Колас". Запомніліся найперш конкурс павозак і выстава парод каней. Найлепшымі аказаліся павозкі з вёсак Падбалоцце, Міжэрычы і Дабрасельцы Зэльвенскага раёна. Яны былі арыгінальныя і прыгожа аформленыя. А на выставе конных парод найлепшым быў беларускі запражны конь Каштан Аляксандра Міхуты. І наогул, калі ў свой час Сапега прыганяў на торг з зэльвенскіх вёсак Бярэжкі і Алексічы жарабцоў англійскай, турэцкай, дацкай і неапалітанскай масці, то сёлета ў нядзелю на зэльвенскім свяце былі пароды коней украінскіх запражных, беларускіх і рускіх цяжкавозаў. Іх прывезлі на выставу амаль з усіх вёсак Зэльвеншчыны.

Цікавым і захапляльным на свяце ў Зэльве былі паказальныя выступленні выхаванцаў конна-спартыўнай школы Ваўкавыска і рыцарскі турнір, арганізаваны гістарычным тэатрам з Полацка "Полацкі звяз", а таксама святочны феерверк і дыскатэка для моладзі. А яшчэ падчас Анненскага кірмашу спявалі Аляксандр Зваровіч, ансамбль "Калейдаскоп" і група "ТАД".

Вядома, у дзень урачыстасці шмат працавала гандлёвых кропак з Зэльвы і Ваўкавыска. Прадаваліся горкія і салодкія напоі, ласункі, сувеніры. Але, на жаль, не было нідзе кніжных выставаў і гандлю. Кнігамі не гандлявалі і на мінулагодніх кірмашах. А шкада... Бо сто пяцьдзесят гадоў таму на Анненскі кірмаш з Вільні кнігар Рафаловіч прывозіў у Зэльву сотні кніг. І зэльвенцы іх накуплівалі столькі, што хапала чытаць на ўвесь год. ▪



▪ І песні былі на кірмашы, і жарты




▪ Рэклама свята

ФУТБОЛ. ПЕРВАЯ ЛИГА



Фота Аляксандра ЗАХАРАНКІ

■ Розыгрыш мяча речицких футболистов разгадывает Дмитрий Оначенко (в центре)



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Автор "дубля" С. Траскевич (слева)

БЕЗВОЛЬНОЕ ПОРАЖЕНИЕ



«КОММУНАЛЬНИК» (СЛОНИМ) — «ВЕДРИЧ-97» (РЕЧИЦА) — 2:4 (1:2)

27 июня (воскресенье). Слоним. Стадион «Юность». 1 200 зрителей.

Судья: Г. Ярец (Минск).
«Коммунальник»: Аснин, Жданович, Скляр, Добриян, Куцко (86, Молчанов), Остапчик, Мисюк (К), Оначенко (79, Захожевский), Траскевич, Климец, Зюлев.
Голы: Траскевич (13, 50), Азаров (15, 88), Димитров (37), Столяренко (66).
Удары по воротам: 15 (7+8) — 17 (9+8)
Удары в створ ворот: 8 (3+5) — 10 (6+4)
Угловые: 2 (1+1) — 5 (4+1)
Офсайды: 2 (1+1) — 3 (0+3)
Фолы: 24 (15+9) — 8 (2+6)

Ну не везет «Коммунальнику» на своем поле! А ведь задор у молодежи есть. «Крепкие ребята и кусачие» — отметил после игры тренер гостей. А ведь начало матча не предвещало беды.

Вначале соперники присматривались друг к другу, а в период начавшегося дождя просто взвинтили скорости. После великолепного паса Климца не менее красиво бьет издали Траскевич, открывая счет. Но через две минуты после разыгранного штрафного Азаров вследствие рикошета в буквальном смысле слова закатывает мяч во владения Аснина. Кстати, арбитр встречи не скупился на фолы слонимчан, чему свидетельствует статистика матча.

На 28-й минуте красивую комбинацию разыгрывают хозяева. Климец играет в стенку с Траскевичем, отдает мяч Мисюку и рвется к воротам. Получив обратный пас, Сергей врывается в штрафную, но бесхитростно бьет — Меркулов на месте. Через минуту Аснин, выбивая в поле мяч, так неудачно это делает, что предмет игры подхватывает Столяренко, совершает проход к воротам, выстреливает, но только штанга выручает слонимчан. Тут же после углового удара коммунальники проводят быструю оборотку, но у Климца не получается завершающий удар.

А на 37-й минуте великолепно передает в штрафную справа Азаров — и Димитров опережает Ждановича, головой поражая правый угол наших ворот. Аснин до мяча не дотягивается.

Второй тайм слонимчане начали активно. Создалось впечатление, что более возрастные приезжие футболисты устали. Прошло всего пять минут — и в счете равновесие. Остапчик из центра запускает "пятнистого" Куцко, Денис проходит по правому флангу и делает прострел. К мячу кидаются Оначенко с Траскевичем, и последнему удается успешно коснуться мяча.

Более опытные футболисты «Ведрича» контролировали ситуацию на поле. И смогли еще дважды заставить хозяев начинать с центра поля. На 66-й минуте Столяренко на замахе оставил не у дел Добрияна и Куцко, а под занавес матча Димитров с правого фланга делает передачу и Азаров зряче ставит жирную точку в этом поединке. «Коммунальник» терпит безвольное поражение, а зрители покидают стадион, не дождавшись финального свистка арбитра.

Александр ЗАХАРЕНКО

МНЕНИЯ О МАТЧЕ

Юрий Данилевич (главный тренер «Коммунальника»):
— Настраивались на победу. Очень хотели выиграть, но желания мало, надо мастерство, а его пока нет. Совершили детские ошибки, пропустили нелепые голы, отсюда — очередное поражение. Футболистам не хватает опыта, а он приходит именно в таких играх, но со временем.

Виктор Павлов (главный тренер «Ведрича-97»):
— Сложная игра. Соперник провел быстрый гол. Но и мы в скором времени отыгрались. Хотя было тяжело — привезли в Слоним реальных 11 игроков, остальные травмированы. Очень жесткая была игра. В «Коммунальнике» молодые ребята, стараются себя проявить. Где-то не хватает хладнокровия и мастерства, порой действуют за счет желания. Команда понравилась, ребята цепкие, кусачие, проявляют бойцовские качества. А победили мы за счет исполнительского мастерства, все-таки наши игроки посильнее...

Андрей Мисюк (полузащитник «Коммунальника»):
— С самого начала по игре шло все хорошо. Затем какие-то нелепые голы, первый — вообще непонятный рикошет. В перерыве тренер дал установку — настроились, заиграли быстро, счет сравняли. Шло все хорошо, перехватили инициативу, а после третьего пропущенного мяча непонятно что с командой случилось. Сил хватало, но ничего не получалось. Даже не знаю, чего нам не хватает.

Результаты остальных матчей 12-го тура:

Барановичи — Торпедо-Кадино	3:1
Верас — Берёза	0:1
Гранит — Молодечно	0:1
Лида — Днепр-ДЮСШ-1	5:1
Вертикаль — Динамо-Юни	1:2
Химик — ЗЛиН	1:1
Сморгонь — Локомотив	1:2

Пропущенный матч 7-го тура:

Динамо-Юни — Береза	1:2

Турнирная таблица после 12-го тура

		игры	В	Н	П	мячи	очки
1.	Локомотив	12	10	2	0	38-13	32
2.	Ведрич-97	12	8	1	3	18-9	28
3.	ЗЛиН	12	6	5	1	15-5	23
4.	Береза	12	7	1	4	19-14	22
5.	Барановичи	12	7	1	4	19-15	22
6.	Молодечно	12	5	3	4	13-10	18
7.	Химик	12	4	6	2	9-6	18
8.	Лида	12	5	2	5	15-11	17
9.	Сморгонь	12	4	5	3	15-11	17
10.	Динамо-Юни	12	5	1	6	14-19	16
11.	Верас	12	4	2	6	9-15	14
12.	Коммунальник	12	3	2	7	12-21	11
13.	Гранит	12	2	5	5	7-10	11
14.	Вертикаль	12	1	4	7	11-19	7
15.	Днепр-ДЮСШ-1	12	1	2	9	10-30	5
16.	Торпедо-Кадино	12	0	4	8	7-23	4

ЦИФРЫ ПО ПОВОДУ

* «Коммунальник» потерпел 30-е поражение на своем поле и пропустил 115-й мяч. Баланс выступлений в домашних встречах: +68=32-30, мячи 223:115.

* Команда провела 5 поединков на своем поле без побед (+0=1-4, мячи 4:10) и потерпела подряд три поражения. Столько же игр без очков встречалось в сезонах 1993/94 (мячи 2:6) и 2001 (мячи 1:4).

* С. Траскевич стал 60-м футболистом, отличившимся за «Коммунальник», и 21-м игроком, сотворившим «дубль». Всего двойных ударов у бомбардиров клуба — 32.

* А. Мисюк провел 85-й матч за клуб, А. Жданович — 20-й, Д. Аснин, С. Климец и С. Траскевич — 10-ые. Кроме того, последний сыграл 35-ю игру в лиге.

* «Коммунальник» потерпел 8-е безвольное поражение, ведя в счете по ходу матча. По два таких проигрыша — от «Ведрича-97» и «Химика».

* Со счетом 2:4 клуб уступил всего 3-й раз. Причем два таких домашних матча проиграно именно речицким футболистам.

* Д. Захожевский стал 138-м футболистом, заигранным за команду в первой лиге.

* Подряд вторую встречу в чемпионате за "Коммунальник" играют по семь воспитанников слонимского футбола.

Александр ЗАХАРЕНКО

СПАРТАКИАДА

КУБОК ОБЛАСТНЫХ ИГР У КОМАНДЫ ПО ПЕРЕТЯГИВАНИЮ КАНАТА

26–27 июня в Гродно проходили VII областные игры трудящихся. За звание победителей боролись волейболисты, стритболисты, мини-футболисты, гиревики, а также состоялись легкоатлетическая эстафета, кросс (тест Купера) и соревнования по перетягиванию каната.

В спартакиаде неплохо выступили слонимчане. Третье место в гиревом спорте занял Юрий Брайчук (ООО «Слонимский мясокомбинат»). С таким же результатом финишировали наши эстафетчики в составе: Андрей Коротько (СПК «Селявичи»), Светлана Куликовская (СШ №2), Николай Шмелев (райисполком), Елена Мусальникова (преподаватель СШ №3). Бронза досталась и мини-футболистам (Валентин Гайдецкий, Александр Кадовбик, Сергей Гриб, Александр Семенов, Анатолий и Валентин Дегиль, Вадим Михно, Игорь Латош, Александр Боровский).

Ну а первое место и Кубок завоевала наша команда по перетягиванию каната, которая в драматическом финале победила соперников из Октябрьского района областного центра.

За почетный трофей боролись Аркадий Брайчук и Юрий Поцынко (оба – РОЧС), Витольд Лыщик (диспансер спортивной медицины), Юрий Бруховецкий (СПК «Сеньковщина»), Сергей Демидик (районная ДЮСШ), Дмитрий Царук и представители УМГ "Белтрансгаз" Сергей Гриб и Александр Семенов. Кроме Кубка, команда получила дипломы областного управления по физической культуре, спорту и туризму и денежный приз. Также дипломы получили и остальные наши призеры областных игр трудящихся.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. АНОНС

В МИНСКЕ – РАВЕНСТВО

Матч 13-го тура чемпионата в первой лиге коммунальники проводят на выезде со столичными динамовцами.

**«Динамо-Юни» — «Коммунальник»
1 июля (четверг).
Марьина Горка.
Городской стадион.
Начало в 18.00.**

Баланс предыдущих встреч: +5=3-3, мячи 16:12 (в Минске – +2=1-2, мячи 8:9).

Бомбардиры: А. Масло – 3 гола; Г. Татарашвили, О. Вербицкий, И. Срибненко, А. Мисюк – по 2 мяча.

Самая крупная победа «Коммунальника» – 5:1 (Минск, 31.5.03 г.; Срибненко–2, Мисюк, Воронцов, Цыганенко; Захаренков).

Самое крупное поражение – 1:4 (Минск, 22.8.02 г.; Анкудинов, Масло–2, Емельянчик; Мисюк).

Александр ЗАХАРЕНКО

«ХРУСТАЛЬНЫЙ МЯЧ»

ВЫИГРАТЬ У МИНЧАН НЕ ПОЗВОЛИЛА УСТАЛОСТЬ

ДЮСШ (СЛОНИМ) — ФК «ДИНАМО» (МИНСК) — 0:2 (0:1)

26 июня (суббота). Слоним. Стадион «Динамо». 150 зрителей.

Судья: Г. Вербицкий (Слоним).
ДЮСШ (Слоним): Декола, Плавский, Алексеенко, А. Скляр, Шикуть, Рудько (К), Тарасюк, Сидорик, Мазур, Лунь, Захожевский (63, Криштопчик).

Очередной матч республиканского первенства «Хрустальный мяч» слонимчане проводили с лидером чемпионата, не знающим очковых потерь. Динамовцы показали себя атлетичной командой, сделавшей ставку на быстрые переходы от защиты в нападение. Стоит заметить, что основная часть минчан — это игроки национальной сборной страны своего возраста.

И уже на второй минуте встречи после ошибки игравшего в защите Мазура нападающий гостей под углом выходит один на один с Деколой и открывает счет в матче.



Алексей Лунь (слева) в игре против пинских футболистов

На протяжении оставшегося времени тайма (а это более сорока минут), слонимские юноши контролировали ситуацию на поле, выполняя все тренерские задумки. Активными действиями выделялись Рудько, Лунь, Алексеенко. Если что у наших футболистов не получалось впереди, то сзади согласованно действовали Декола и Алексеенко.

Впереди хорошо смотрелся Лунь. В одном из моментов Алексей отдает выверенную передачу Захожевскому, но только лужа помешала получить мяч Дмитрию. Тут же по остановившемуся мячу бьет все тот же Лунь — сфера улетает рядом с верхним углом минских ворот.

Запомнилась еще одна многоходовка в исполнении слонимчан. Начали ее Скляр, Плавский и Рудько, а заканчивал выходом один на один Захожевский. Но Дмитрий завершающий удар пробивает бесхитростно, и мяч от вратаря минчан уходит на угловой. Тут же после подачи от углового флажка Рудько в сутолоке у динамовских ворот защитники минчан выносят "пятнистого" метров на 25, следует обратный навес — и оказавшийся перед воротами Алексеенко без остановки мяча пробивает мимо ворот. Хотя у него было время на более осмысленные действия.

По первым минутам второго тайма было видно, что хозяева поля уверовали, что должны забить и закончить встречу с положительным результатом. У них получались и проходы, и передачи, не хватало только завершающего удара. Хороший момент упускает Лунь, который был выведен один на голкипера минчан, но промедлил с ударом, защитник гостей догнал форварда, и момент был упущен. Удачной оказалась и замена. После ухода с поля Захожевского вперед был выдвинут Мазур, который смотрелся довольно-таки неплохо.

Но на действиях слонимчан сказалась усталость. Минчане же выглядели технично командой, которой были присущи мобильность, многоходовки, дальние удары. А на 69-й минуте после подачи углового и ошибки Сидорика гости увеличили свое преимущество, когда нападающий "Динамо" кивком головы наказал хозяев поля.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ

СЕМИНАРИСТЫ ТОЖЕ УМЕЮТ ИГРАТЬ В ФУТБОЛ

Недавно в польском городе Калиш состоялся двадцатый чемпионат Европы по футболу среди католических семинарий.

В соревнованиях выступили двенадцать команд, среди которых были и белорусы, впервые, к слову, принимавшие участие в подобных стартах.

Нашу страну представляла гродненская Высшая духовная семинария. И в дебютном первенстве наши земляки выступили достойно, разгромив такие футбольные державы, как Италия (5:0), Словения (7:0), Ирландия (6:0). Две нулевые ничьи с французами и поляками вывели белорусов в полуфинал.


Белорусская команда семинаристов с Кубком результативности (средний в нижнем ряду — Артур Малафей)

Но ответственные встречи (1/2 финала и матч за 3–4 места) наши семинаристы уступили сильнейшим коллективам Польши и Ирландии с одинаковым счетом 0:1, довольствовавшись четвертым местом. Кстати, за это им были вручены диплом и медали. Кроме того, белорусы получили специальный Кубок, став самой результативной командой на чемпионате.

Примечательно, что в составе белорусской дружины были два наших земляка. Это капитан команды Артур Малафей и Дмитрий Нестер, которые учатся в ВДС. Стоит отметить, что руководство семинарии выразило огромную благодарность тренеру гродненской СДЮШОР-6 Михаилу Хоменкову и ДЮСШ «Альбертин» города Слонима Александру Гусару за оказанную помощь в подготовке к чемпионату Европы.

Александр ЗАХАРЕНКО

ГРЕБЛЯ

СЛОНИМЧАНИН В СБОРНОЙ БЕЛАРУСИ

С призами вернулся из немецкого города Бохума воспитанник тренера СДЮШОР №2 Владимира Лойко слонимский гребец Валерий Дубовик.



Валерий Дубовик

Он принял участие в состоявшейся 19–20 июня традиционной Бохумской регате. Этот немецкий город посетили спортсмены двадцати двух стран.

Валерий стал вторым на дистанции 500 метров в одиночке (К-1). Кроме того, в составе четверки (К-4) вместе с минчанами Дмитрием Ивановым и Александром Лепешко, а также Денисом Жигадло из Мозыря Валерий был третьим на дистанции 1 000 метров и четвертым на пятьсотметровке.

Сейчас Валерий Дубовик находится на сборе национальной команды страны в Бресте. Сборная Беларуси готовится к стартующему в конце июля в польском городе Познань чемпионату Европы. Следует отметить, что представители слонимской школы гребцов давно не принимали участия в столь ответственных европейских стартах.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ

ОДИН ПРИЗ В СЛОНИМ ВСЁ-ТАКИ ПРИЕХАЛ

С 22 по 25 июня в Гродно на стадионе сельхозинститута прошла областная спартакиада школьников по футболу среди юношей 1989–90 годов рождения. В соревнованиях выступили одиннадцать коллективов.

Слонимские футболисты (тренер — Руслан Корнев) начали турнир с двух крупных побед. Вначале были повержены футболисты Мостов — 4:0 (Юзвович-3, Грацкевич). И хотя слонимчане действовали от обороны, прекрасные индивидуальные действия и организационные качества продемонстрировал Дмитрий Юзвович. Во втором матче с таким же счетом наши игроки обыграли ровесников из Дятлова (голы забили Юзвович-3 и Левошик). И вновь отличился «мотор команды», сотворивший второй «хеттрик». Во втором тайме тренер слонимчан выставил дублеров, но они не смогли увеличить преимущество, добытое в первой половине встречи.

Принципиальный матч выдался с первой командой хозяев. На 9-й минуте сильнейшим по силе ударом с двадцати метров Юзвович открывает счет. Мяч попадает в перекладину, ударяется в землю, снова оббивает перекладину и опускается в сетке ворот. Гости могли развить успех, но дважды мастерство подводило Павлова. Зато две ошибки слонимчан в обороне позволили областным футболистам выйти вперед. Спас команду от поражения все тот же Юзвович, удачно завершив штрафной, выполненный п под конец встречи Левошиком. А в добавленное время наши юноши могли выйти вперед, но Соколовский помешал слонимскому голеодору нанести прицельный удар.

Последний матч в группе со Сморгонью должен был расставить все точки над "і". Но игрокам из Слонима пришлось отыгрываться, пропустив мяч со штрафного удара. И ответный



Дмитрий Юзвович (слева)

гол был-таки забит, конечно же, Юзвовичем. Дмитрий прошел с мячом со своей половины поля, показав великолепную индивидуальную игру. Со счетом 1:1 игра и завершилась.

Хозяева играли с командой Дятлова. Чтобы занять первое место и выйти в финал, им необходимо было побеждать с разницей в восемь мячей. И благодаря непринципиальному судейству гродненчане задачу выхода в финал выполнили успешно, разгромив соперников со счетом 10:0.

Зрелищным выдался матч за 3–4 место между командами Слонима и Гродно–2. Но масса ошибок в обороне позволила войти в призеры представителям областного центра. И хотя слонимчане заняли четвертое место, один приз в Слоним всетаки приехал. Лучшим бомбардиром спартакиады стал Дмитрий Юзвович, забивший 9 голов и на 3 мяча опередивший ближайших преследователей.

По словам тренера слонимчан Руслана Корнева, организация спартакиады была не на должном уровне. Не было никаких элементарных условий: отсутствовали раздевалки, душ, туалет. Хотя игрой своих подопечных наш коуч остался доволен, а вот результатом — нет.

Александр ЗАХАРЕНКО

СЛОВА ПРА ГАЗЕТУ

Сёння пра "Газету Слонімскую" разважае наш зямляк доктар філалагічных навук, пісьменнік і навуковец Мікола Арочка, які жыве ў вёсцы Вецявічы Слонімскага раёна.



НЕЗАМУТНЁНАЕ АКНО

Для мяне "Газета Слонімская" – незамутнёнае акно ў свет людзей і падзей. Яна пастукалася ў шыбіны маёй сённяшняй вясковай хаты з першага дня нараджэння. Заўсёды рады бачыць яе, слонімскую вястунню, кожнае свежае яе з'яўленне ў веснічках ці ў клямцы дзвярэй. Чаму? Газета мяне не расчароўвае, калі разгортваю, як нярэдка ўсё часцей здараецца з іншымі нумарамі выданняў (некаторыя па-ранейшаму выпісваю), дзе, пры іх праглядзе, міжволі выдыхаецца: "Пустая..." – ці не найгоршы прысуд, калі і сапраўды няма чаго чытаць.

У вашай "Слонімскай", дзякаваць Богу, заўсёды ёсць "гвозд" нумара. Разумею, як няпроста ўладкаваць такі "гвозд" у нумар пры сучасным складана-крутым "коле дзён". Пад рубрыкай "Памяць", адной з самых змястоўных у газеце, – аж душа зайшлася, калі раптам, як нядаўна, ашаломіў артыкул "Ісьціна супраць перамогі". Многія рэчы ўласна мне вядомыя. Ды не магу захлынацца ад суперажывання трывожна-балючых імгненняў разам з аўтарам аповеду Міхасём Скоблам – пра апошні шлях Васіля Быкава, пра яго вечную мужнасць маўлення, пра нашу цяжкую дарогу да незалежнай Беларусі ("дадому"!). А я ж сам добра ведаў яго, салідарызаваўся на канферэнцыях, нават з калегамі гасцяваў у яго доме, у яго сям'і.

Колькі ў згадках-успамінах яшчэ невычэрпнага, у роздумах аб нашым лёсе народным! Асэнсаваць – рукі не даходзяць.

Што яшчэ ўражвала? Вядома ж, удумна-ключавыя матэрыялы, прысвечаныя гістарычным постацям і падзеям зямлі Слонімскай, скажам, "Дзеі над Шчарай" Васіля Супруна – вядомага краязнаўца, хоць і сціпла замоўчваем пра яго, пакутніка сталінскіх канцлагераў. Пра яго ж самога зачакаўся жахлівы летапіс па ўсёй навале перажытага.

А як разумна, далёкасяжна вымаўляе сябе і прагалошвае праз магчымасці незалежнай трыбуны "Газеты Слонімскай" славуты пабрацім наш, зямляк Алег Лойка ў паэмах і артыкулах ("Плач зямлі Слонімскай", "Успамін пра бацьку" і інш.)

Пахвальна, што газета ваша знаходзіць такія ракурсы і не скупіцца на зямляцкую праведную споведзь. А пра яго ж самога, пра Лойку, буйную адраджэнскую асобу нования часу, таксама ж аповед зачакаўся.

Зрэшты, здараюцца і прагалы, аж дзіўна, як у забыццё трапляць могуць і ўсталяваныя знакавыя постаці, як сёлета наш мужны, ахвярны Валянцін Таўлай са сваім 90-годдзем, адзначаным незразумелым маўчаннем. Замовілі б з газеты, уласна мне – рысы пад ім, дарагім земляком, ніколі мне не падвесці. У заходнебеларускай вызваленчай эпапеі наш Валянцін – другі ж паэт пасля Максіма Танка, а то і ўпоравень з ім.

Перадрукоўка праблемных артыкулаў, аўтараў сваіх і замежных, – зручная нагода інфармацыйнага пашырэння свету ў акне, што так многім карціць затлуміць, замуціць падманам. Газета дасведчана выкарыстоўвае гэты спосаб "прамыўкі" "шыбін старых камяніц", што бачылі і помняць усё. Проста ўсёй увагай прыкіпаеш да праніклівых развагаў інтэрв' ю са святаром Янам Майсейчыкам "Царква... астравок нашай радзімы" – пра адзіны наш дом Хрыстовы. Які глыбінны роздум над канфесійным вызнаннем. З пачатку гэтага XXI стагоддзя ён, артыкул ("ГС" ад 16 чэрвеня 2004) нашага святара, як надзённа перагукваецца – ледзь не праз цэлае стагоддзе – з купалаўскім трывожнавяшчунным роздумам, скандэнсавана выкладзеным у артыкуле Леаніда Лыча "Прабач нам, Янка Купала...". Клапатліва-мудры пясняр наш кранаецца адвечнай праблемы і веры. Сёння кранання гэтай праблемы ох як трэба, хоць асцярожна, тонка, але каб агалялася ўсё ж праўда асіміляцый і экспансій, для якіх рэлігія – сродак патаптання нацый, іх мовы, культуры. У імя непераходных спрадвечных каштоўнасцей, на якіх усталявана непадлегласць нацыі, сёння ж, як і раней, самыя годныя і мужныя ахвяруюць здароўем, жыццём. Магутныя духам здатныя на такі подзвіг. Дзейсным і блаславёным хай будзе наша слова пра іх.

Мікола АРОЧКА

••• КОНКУРС •••

Человек, которого люблю

Рисовать можно на всем, что попадется под руку: асфальте, обоях, стенных шкафах и даже на мамином платье. Но редакция "Газеты Слонімской" объявляет конкурс для тех, кто предпочитает рисовать на бумаге. И даже на каникулах не расстается с карандашами и красками.

Потому что рисовать – это так интересно! Можно покрасить солнце в зеленый цвет, а полоски на зебре сделать цветными. А еще можно собрать за одним столом всю свою большую семью, потому что в реальной жизни это сделать очень трудно.

Если тебе не исполнилось 14 лет и ты любишь рисовать, конкурс "Человек, которого люблю" – для тебя. Бери в руки карандаши и краски, а потом отправляй или приноси свою работу в редакцию "ГС" по адресу: г. Слоним, ул. Комсомольская, 8. Не забудь подписать свою работу, указать домашний адрес и телефон. И обязательно напиши, кого ты рисовал.

Из работ участников будет сделана выставка в редакции, а самые яркие из них будут отмечены ценными подарками.

••• ИНФОРМАЦИЯ •••

ЗДАРЭННІ

ЗАГІНУЛІ Ў ВЫНІКУ АВАРЫІ 26-ГАДОВЫЯ ХЛОПЦЫ

Ноччу 28 чэрвеня на аўтадарозе Слонім—Масты ля вёскі Сянькоўшчына адбылося страшнае дарожна-транспартнае здарэнне.

Вадзіцель аўтамабіля "VW-Пасат", рухаючыся на вялікай хуткасці, не справіўся з кіраваннем.

Аўтамабіль перакуліўся. У выніку гэтага двое 26-гадовых пасажыраў загінулі на месцы, а кіроўцу даставілі з цяжкімі траўмамі ў бальніцу.

У гэты самы вечар аварыя адбылася і на Ружанскай вуліцы ў Слоніме. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем, і легкавік "БМВ" стукнуўся ў дрэва. Кіроўца і пасажыры атрымалі траўмы, іх завезлі ў бальніцу. Па ўсіх здарэннях вядзецца праверка.

Пра гэтыя здарэнні карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Слонімскім аддзяленні ДАІ.

Сяргей ЧЫГРЫН

Прогноз погоды

30 июня:

Облачно с прояснениями. На большей части территории кратковременные дожди, днем в отдельных районах грозы. Ветер западный 6–11 м/с, днем при грозе порывы до 14 м/с. Температура воздуха ночью +7°+12°, днем +16+21°.

1–2 июля:

Переменная облачность. **1.07** преимущественно без осадков, **2.07** на большей части кратковременные дожди, местами грозы. Ветер западный, юго-западный 5–10 м/с, порывы до 14 м/с. Температура воздуха **1.07** ночью +6°+11, днем +18°+23°, **2.07** ночью +9+14, днем +16°+21°.



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

▪ У чэрвені было пару сонечных дзён і ўсіх пацягнула ў ваду

Информацию предоставил Гродноoблгидрометцентр

Галоўны рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК

Рэгістрацыйнае пасведчанне №947 ад 24.03.1997 года.

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

e-mail: gs@mail.grodno.by gs@promedia.by

Наш адрас:
231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.

Тэлефоны рэдакцыі:
8-(01562) 2-14-39, 4-79-34,

Рэдакцыя
Намеснік галоўнага рэдактара Сяргей ЧЫГРЫН
Адказны сакратар Мікола КАНАНОВІЧ
Аддзел навін Вольга ШЫНКЕВІЧ
Аддзел сацыяльных праблем Яніна МЕЛЬНІКАВА
Фотакарэспандэнт Таццяна ПЛАХЕТКА
Карэктар Жанна ПЛЕШКО

Вёрстка і дызайн
Аляксей ГАРАЙНАЎ
Аляксей ВАРАНОВІЧ

Галоўны бухгалтар Тамара ЛУНЬ
Бухгалтар Ганна ВАРАНОВІЧ
Юрысконсульт Сяргей ГЕРАСІМЧЫК
Аддзел падпіскі і распаўсюджвання
Загадчык Анатоль ВАЛАДАШЧУК
Супрацоўнік Аляксандр ГРЫЦКО

Тэлефон рэкламнай службы
8-(01562) 2-49-39
Начальник рекламной службы Ганна ВАЛАДАШЧУК
Агент рэкламны Сяргей ЧУКАЛІН

Аб'ём – восем умоўных друкаваных аркушаў. Надрукавана ў ГАУП "Слонімская друкарня", 231800, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16. Заказ № **2028**

Тыраж нумара **10100**

Час падпісання да друку па графіку 29 чэрвеня 2004 года 18:00. Дзяжурны па нумары **Сяргей ЧЫГРЫН**

Кошт свабодны